# Адкрываючы музычныя скарбы

**Чарговая інтэрактыўная лекцыя з серыі «Творы беларускіх кампазітараў у кантэксце еўрапейскай культурнай традыцыі» была прысвечана творчасці Мікалая Аладава, Пятра Падкавырава, Рыгора Пукста, Мікалая Чуркіна, Анатоля Багатырова і іншых.**

Лекцыю ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі праводзілі аспіранты Цэнтра даследаванняў беларускай мовы, культуры і літаратуры НАН Беларусі пад кіраўніцтвам кандыдата мастацтвазнаўства Галіны Цмыг. Прагучала цікавая інфармацыя пра развіццё беларускай камернай музыкі XX стагоддзя.

Напрыклад, Лізавета Зямскова ўдзяліла частку выступлення наватарскім кірункам музычнага авангарда XX стагоддзя, які зараджаўся пасля сусветных войнаў як адлюстраванне ў мастацтве вялікіх зрухаў і прыйшоў на Беларусь значна пазней — у 60—70-я гады. Лектар прадэманстравала, як авангардныя рысы адбіліся ў творчасці Дзмітрыя Смольскага (1937—2017), Сяргея Картэса (1935—2016), Яўгена Глебава (1929—2000) і іншых беларускіх кампазітараў.

Лекцыі праходзяць кожную другую сераду месяца ў 15.00 у зале нотных дакументаў.

**Эла ДЗВІНСКАЯ**